**Дз. Берастава**

# ЭТНІЧНАЯ СВЯДОМАСЦЬ – АСНОВА САМАВЫЗНАЧЭННЯ НАРОДА

Цэнтральным паняткам у пастаўленным пытанні з'яўляецца панятак нацыі. Беларуская ідэнтычнасць не нагадвае нацыю з пэўным наборам адзіных міфаў, каштоўнасцяў, стэрыатыпаў. Нацыянальнае пытанне і пытанні з ім звязаныя стаяць у Беларусі вельмі востра. Разглядаючы па чарзе паказнікі нацыі, такія як мова, рэлігія, агульнасць эканамічных інтарэсаў, светапоглядаў і культуры на прыкладзе беларусаў, мы амаль не заўважаем адзінства.

Па І. Бабкову, беларуская нацыя фармавалася адразу ў двух кірунках. Беларуская ідэнтычнасць фармавалася на аснове «базавых» фактараў, такіх як тэрыторыя, мова, этнічнасць. Наяўнасць іншых фактараў, дзяржаўных і рэлігійных, спрыяла фармаванню білінгвістычнай шляхты. Яе культурна-палітычная самастойнасць фармавалася цягам чатырнаццатага – васямнаццатага стагодзьдзяў. Пераход на польскую мову шляхты не пазбавіў яе пачуцця культурнай і гістарычнай адметнасці, як, зрэшты, не выцесніў традыцыйныя мовы (беларускую/літоўскую). У выніку сфармавалася наступная сытуацыя: традыцыйная культура, манамоўная, якая захавалася нягледзячы на стагоддзі выцяснення, і білінгвічная шляхта. Менавіта неаднастайнасць вядзе да паўставання розных супярэчлівых версій ідэнтычнасці.

У выніку ў дачыненні да фармавання беларускасці паўстаюць пэўныя тлумачальныя мадэлі, як, напрыклад, тэорыя «затрыманай» нацыі, якая ніяк не можа дайсці да свайго «канца» праз неспрыяльныя ўмовы, альбо тэорыя «вясковай нацыі», якая вылучае вяскоўцаў як адзіных «сапраўдных» прадстаўнікоў беларускага этнасу. Натуральным вынікам гэтага і есць вобраз слабой нацыі.. Але кожны з гэтых пакладзеных у аснову вытлумачэння фактараў імкнецца прывесці сітуацыю да адной роўніцы, выключаючы «іншае» альбо разглядаючы «іншае» як штосьці неістотнае і небеларускае, што некарэктна. Замест таго, каб прыняць рознасці, яны трымаюцца за утопію гамагеннай культуры, таму разглядаюць сеняшнюю нацыянальную думку як недаробленую.

Вышэйшпералічанае прыводзіць нас да разумення гетэрагеннасці беларускага грамадства, разглядаючы шляхту, сялянства, вернікаў розных канфесій элементамі аднаго грамадства, аб'яднаных думкай тутэйшасці. Таму абапіраючыся ў першую чаргу на аднастайнасць, мы не ўбачым беларускую ідэнтычнасць. Імкненне «падбіць» сітуацыю пад пэўны «стандарт» як мінімум некарэктна. Мы не можам параўнаць сваю ідэнтычнасць з суседнімі краінамі, бо ў іх мы не назіраем падобных фактараў фармавання нацыі. Зараз трэба імкнуцца да прыняцця разнастайнасці нашай беларускасці і яе далейшага развіцця ў незалежнай краіне.